# ✵ ПРАДМОВА

Сёлета «ARCHE» пачынае шосты год свайго жыцьця. Увесь свой век ён шукаў уласнае «Я», сумяшчаў несумяшчальнае для эўрапейскіх выданьняў: айчынную і замежную літаратуру, філязофію і эсэістыку, культурныя, палітычныя і эканамічныя аналізы, рэцэнзіі на кніжныя навінкі і многае іншае. Аб'ём нумароў вагаўся ад сотні да пяці з палавінай соцень старонак, рубрыкі пастаянна зьмяняліся, фармат залежаў ад прыхамаці друкароў. Нязьменным застаўся толькі дызайн, які быў распрацаваны ўжо ў далёкім 1998-м.
Сёлета мы вырашылі зьмяніць вонкавае аблічча «ARCHE». Мы спадзяёмся, што гэта падкрэсьліць яго ўнутраную эвалюцыю ў кірунку грамадзка-палітычнага выданьня, нацэленага на прадукаваньне ідэй. Таксама мы спрасьцілі яго ўнутраную будову. Цяпер усе матэрыялы групуюцца ў чатыры падставовыя рубрыкі: «крытыка», «аналітыка», «эсэістыка» і «літаратура».
У астатнім «ARCHE» застаецца верным беларускай культуры і чуйным да патрэбаў, якія яна дыктуе: не абмяжоўваць беларускае слова абсягам мастацкай літаратуры, выяўляць і абмяркоўваць ключавыя для аздараўленьня інтэлектуальнага жыцьця праблемы, гуртаваць інтэлектуалаў, якія бачаць Беларусь культурна і эканамічна разьвітай нацыянальнай дзяржавай.
Мы жывём у грамадзтве, дзе культура была, ёсьць і, напэўна, будзе аб'ектам палітызацыі. У такім грамадзтве культурныя ініцыятывы могуць лічыцца палітычна небясьпечнымі, а палітычных лідэраў крытыкуюць за іх разбуральную для культуры дзейнасьць. Для выданьняў накшталт нашага гэта дае новыя шанцы. Мяркуем, што абнаўленьне дызайну і ўнутранай структуры «ARCHE» дапаможа іх выкарыстаць лепей. Таксама ў нашых плянах — увядзеньне падпіскі і правядзеньне рэклямных кампаній. Адным словам, рыхтуйцеся.